**Асцярожна, чадны газ!**

Паважаныя грамадзяне! З паніжэннем тэмпературы паветра і ўзімку будзьце пільнымі пры выкарыстоўванні газавых ацяплявальных прыбораў і праточных воданагравальнікаў.

Асаблівую небяспеку ўяўляюць прадукты згарання, гэтак званы чадны газ СО, які можа вас атруціць. Для чалавека смяротная доза чаднага газу ў паветры складае 1%. Каб не здарылася бяды, сістэматычна правярайце наяўнасць цягі і спраўнасць дымавых і вентыляцыйных каналаў! Па праверцы вентыляцыйных, дымавых каналаў і выдачы актаў іх праверкі можна звяртацца ў Браслаўскі РАНС па тэл.62201.

Строга забараняецца карыстацца газавымі прыборамі пры няспраўнай аўтаматыцы бяспекі і адсутнасці цягі ў дымавых і вентыляцыйных каналах!

Не выкарыстоўвайце газавыя пліты для абаграванне памяшкання!

Не прадухіляйце самастойна няспраўнасць газавых прыбораў, забараняецца ўжываць адкрыты агонь пры адчуванні паху газу!

Будзьце асцярожныя і ўважлівыя пры карыстанні газам і памятайце, што праз вашае нядбайнае стаўленне да ўсталяваных правілаў могуць пацярпець блізкія вам людзі.

Для забеспячэння вашай бяспекі і бяспекі вашых родных ВУ «Браслаўгаз» прапануе набыць апавяшчальнік газу СО аўтаномны. Памятайце  - вашае жыццё ў вашых руках!

Датычна пытання набыцця апавяшчальніка газу СО аўтаномнага звяртайцеся ў ВУ «Браслаўгаз» па тэл.31349